всестороннее изучение международного опыта, поиск и своевременное внедрение современных технологий, инновационный подход к развитию национального туроперейтинга, создание новой и модернизация существующей туристической инфраструктуры, повышение уровня сервиса, а также активное продвижение национального туристического продукта в средствах массовой информации и глобальной сети Интернет.

**Литература**


1. *Решетников Д. Г.* География туризма Республики Беларусь. Минск, 2011. С. 320.
2. *Решетников Д. Г.* Приоритетные направления туристской политики по оптимизации факторов конкурентоспособности туристского комплекса Беларуси // Белорусский журнал международного права и международных отношений. 2003. № 1. С. 28.
3. *Полещук Н. И.* Экономико-географические аспекты развития въездного туризма в Беларуси. Интернет-адрес: // http://www.sgu.ru/files/nodes/9769/028.pdf.
4. *Поп И. И.* Энциклопедия Подкарпатской Руси. Ужгород, 2001.


## ВОБРАЗ БОЖАЙ МАЦІ Ў БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ГРАВЮРАХ


**П. М. Карпека**


Культ цудадзейных вобразаў Божай Маці быў вельмі распаўсюджаны на Беларусі. Гэта праяўлялася ў такой з’яве, як фундатарства і апека магнатэрыі над пабудовай манастыроў і цэркваў на месцах цудоўных з’яўленняў (Завішаў у Лядах, Радзівілаў у Свержані, Копец у Купяцічах, Стэткевічаў у Куцейне і Баркалабаве і інш.), выданні кніг і літаратуры, прысвечанай цудоўным выявам Маці Божай (Т. Баравік, Я. Суша, Л. Кішка) і канешне распаўсюджванне выяваў праслаўленых вобразаў Божай Маці ў графіцы, жывапісу. Спіс можна працягнуць – у простым жыцці аб веры ў цудадзейную моц выяваў Божай Маці сведчылі паломніцтва да праслаўленых цудамі месцаў і абразоў, шматлікія воты і падарункі абразам Божай Маці як падзяка за дапамогу, складанне песен і гімнаў да Божай Маці [5].

Маці Божая Вастрабрамская прадстаўляе паясную выяву Марыі, з апушчанай і схіленай трошкі ўправа галавой, скрыжаванымі на грудзях рукамі. Мяркуюць, што Божая Маці прадстаўлена ў позе беззаганнага зачацця. Адметнае шанаванне абраза пачалося ў канцы XVII – пач. XVIII ст. У кнігах пра цудатворныя абразы 1650–1687 гг. вастрабрамскі абраз яшчэ не называецца. Шырокую славу ён набыў у 1702 г. пасля паражэння шведаў, якія спрабавалі яго папсаваць. Уражанне на жыхароў горада зрабілі шматразовыя выратаванні абраза ў час пажараў Вільні 1706 г., 1748–1749 гг., 1754 г. Пра Вастрабрамскую Мадонну, як

абаронцу Вільні ў 1756 г. была надрукавана песня, тады ж уведзена ўрачыстае святкаванне Апекі Маці Божай [2, с. 392–393].

Не мог такі папулярны ў народзе вобраз застацца па-за ўвагай народных майстроў.

Прыкладам народнай інтэрпрэтацыі вобраза Божай Маці з’яўляецца народная гравюра Маці Божай Вастрабрамскай з калекцыі Беларускага музея ў Вільні (мал. 1). Вакол самой выявы Божай Маці – ілюстрацыі яе цудаў: выратаванне чалавека, выпаўшага з вакна будынка, уваліўшагася ў калодзеж, хворага, які вылічыўся праз Яе заступніцтва, выява жаўнера на кані (магчыма сімвал цуда пад час захопа Вільні шведамі і вызвалення горада праз дапамогу Вастрабрамскай Мадонны). У нізе – Вільня ў вогнішчы – як узгадка аб цудоўным выратаванні і самаго абраза пад час пажару, і выратаванні Вільні праз заступніцтва Святой. Трэба звярнуць увагу на сімвалы і гербы гэтага дрэварыта. Унізе гэта герб Тышкевічаў [3, с. 18] і герб-арол. Такая сімволіка падкрэслівае значнасць абраза для зямель Беларусі, Літвы, Польшчы. А вось пад выявай Маці Боскай народны майстар намаляваў укленчаны народ. Пры тым па выгляду гэта просты люд, нават сялянскі. І гэта не дзіўна. Пра цуды, звязаныя з абразамі Божай Маці беларусы чулі нярэдка дома, па цэрквах і касцёлах, праз спевы духоўных вершаў. Пра народнае шанаванне Вастрабрамскай Багародзіцы сведчыць наступны духоўны верш:




*Мал. 1. М*аці Божая Вастрабрамская. Народны каляровы дрэварыт

Полная есть чудесъ твоихъ вся вселенна,
Въ Острихъ Вратахъ града Вильно Богоявленна!
Слепыхъ, хромыхъ и всехъ больныхъ
Изцеляешь тамъ притомныхъ,
Прашу и мене!
Защищаешь отъ пожаровъ, утопленія,
Отъ смертнаго изъ высоты упаденія
На всехъ войнахъ приключенныхъ
Хранишь своихъ возлюбленныхъ
Храни и мене! [4, с. 415]

Абраз Маці Божай Жыровіцкай – яшчэ адна з хрысціянскіх святынь на Беларусі, якая ўшаноўваецца як цудатворная. Адлюстраванне Жыровіцкай Божай Маці ў выяўленчым мастацтве не рэдкасць. Яшчэ ў 1682 г. Лявонцій

Тарасевіч пад час працы ў Вільні зрабіў цудоўную гравюру Жыровіцкай Маці Божай з Пятром і Паўлам. Яшчэ адна гравюра Л. Тарасевіча была змешчана ў кнізе Я. Дрэўса «Methodus peregrinationis menstruae Mariana». Досыць падрабязная выява Маці Божай Жыровіцкай на гэтых гравюрах магла садзейнічаць таму, што творы Л. Тарасевіча сталі прататыпам і прыкладам для твораў графікі і жывапісу.

Народны малюнак з выявай Маці Божай Жыровіцкай цікавы тым, што напрамую адлюстроўвае легенду пра паходжанне абразка Жыровіцкай Божай Маці (мал. 2).




Мал. 2. Маці Божая Жыровіцкая. народная гравюра па медзі. XVIII ст.

З'яўленне цудатворнага абразка адбылося наступным чынам: у 1470 г. пастухі Ал. Солтана заўважылі на дрэве незвычайнае святло (дата спорная, бо Ал. Солтан тады яшчэ не валодаў Жыровіцамі). Падыйшоўшы бліжэй, яны заўважылі на дзікай грушы ля крынічкі маленькую ікону Маці Божай, ад якой ззяла святло. Пастухі прынеслі ікону Солтану, але на наступны дзень яна прапала, і пастушкі зноў знайшлі яе на тым жа дрэве. Крануты цудам, Ал. Солтан пабудаваў на тым мейсцы драўляную царкву [1, с. 84].

У цэнтры народнай гравюры паказана дрэва з крупнай выявай цудоўнага абразка ўверсе паміж галін. Злева ад дрэва паказаны ўкленчаўшыся пастушок. У руке ён трымае посах, на заднім плане за ім выявы жывёлаў. Справа пад дрэвам асоба ў плашчы, хутчэй за ўсё гэта сам землеўладар Ал. Солтан. Унізе надпіс: Jmako Beati sime Virginis Maria Zyrovicensis. Вакол кампазіцыі рамка з арнаментам вінаграднай лазы. Так, у творы народнай графіцы праявілася народная вера ў цудоўнае з'яўленне абразка Божай Маці. Можна меркаваць, што гэты твор адлюстроўвае вобраз Божай Маці, звязаны з народнай інтэрпрэтацыяй легенды аб Ёй.

У калекцыі К. Тышкевіча мелася гравюра з выявай яшчэ адной святыні – Маці Божай Барунскай, якая магла быць прыкладам для твораў народнай графікі [6]. Сам твор народнай графікі не захаваўся, але ў каталозе да Мінскай абласной выставы старажытнасцяў і цудоўных твораў, якая праходзіла ў 1917 г., узгадваецца пашкоджаны дрэварыт Маці Божай Барунскай. З апісання вядома, што карона і адзенне Божай

Маці былі расфарбаваны ў чырвоны колер [3, с. 15]. Трэба заўважыць, што гэтая народная гравюра, у адрозненні ад гравюры з калекцыі К. Тышкевіча і абраза народнага майстра з в. Корчыцы Брэсцкай вобласці, прадстаўляе каранаваны вобраз Маці Божай Барунскай.

Цудатворны абраз Маці Божай Кракаўскай у Вялікім княстве Літоўскім стаў вядомым пасля выхаду ў 1684 г. кнігі «Methodus peregrinationis menstruae Mariana» пра 12 цудатворных абразоў у храмах Рэчы Паспалітай, напісанай прафесарам Янам Дрэўсам, з гравюрамі Лявонція Тарасевіча.

Захаваўся народны дрэварыт «Маці Божая кармелітаў на Пяску», працы майстра П. Комара (сяр. XVIII ст.) Гравюра выканана ў вохрыста-карычневай каляровай гаме. Кампазіцыя гравюра падзелена на дзве не прапарцыянальныя часткі. У ніжняй, меншай, часцы кампазіцыі – краявід мястэчка Кракаў, з выявай касцёла кармелітаў на Пяску па цэнтры. У цэнтры большай часцы гравюры – Маці Божая з младзенцам Езусам на левай руцэ. Асабліва ўражваюць упрыгожаныя кароны на галавах Маці і дзіцятка. Прычым, у адрозненні ад гравюры Л. Тарасевіча, карону мае не толькі Божая Маці, але і Езус. На шыях Младзенца і Маці падвескі. Асаблівасцю гэтага народнага малюнка з’яўляецца расліны арнамент фона. Таксама незвычайны фон мае абраз Маці Божай Кракаўскай з в. Ст. Дзявяткавічы Слонімскага раёну. На ім Панна Марыя прадстаўлена сярод жоўта-вохрыстых аблокаў, што адлюстроўвае адносіны да Яе вобразу, як да характава ўзвышанага, незямнога. У народным успрыманні вобраз Божай Маці як Царыцы Нябеснай не рэдкасць. Падцверджанне таму – духоўныя вершы, дзе да Божай Маці звярталіся, як да ўладаркі неба [4, с. 412, 415].

Разгледжаныя прыклады беларускіх народных гравюраў сведчаць аб папулярнасці вобраза Багамацеры ў народным выяўленчым мастацтве. Народныя гравяры, а часам і жывапісцы, выкарыстоўвалі кніжныя гравюры для сваіх твораў, але ніколі не капіравалі поўнасцю, бо падсвядома ці наўмысана прапускалі вобраз праз прызму сваіх уяўленняў і пачуццяў. Гэта праявілася ў кампазіцыі народнай гравюры, якая можа ўключаць такія элементы, як адлюстраванні цудаў, мясцовасці і пейзажу, звязаных з Маці Божай, што паказваюць кампазіцыі дрэварытаў Маці Божай Вастрабрамскай, Маці Божай Кракаўскай. Трансфармацыі падвяргаліся і вобразы Божай Маці ў звязаных з імі легендах і паданнях, прыкладам чаго служыць народная гравюра Маці Божай Жыровіцкай.

**Літаратура**

1. *Ар-т Николай.* О Жировицкой чудотворной иконе Божией Матери и о Жировицкой обители // Литовские епархиальные ведомости. 1863 г. №3. С. 83–100.

2. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя: у 2 т. / Беларуская Энцыклапедыя імя П.Броўкі. Мн., 2005–2010. Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя. 2005.
3. Каталог Минской областной выставки древностей и изящных изделий / Сост. А. Иппель. Мн., без года.
4. *Шейн П. В.* Белорусские народные песни, с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями, с приложением объяснительного словаря и грамматических примечаний. СПб, 1874.
5. *Chomik P.* Wpływ kultu ikon na postawy religijne społeczeństwa Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI–XVIII wieku // Chrześcijańskie dziedzictwo duchowe narodów słowiańskich, pod red. Z. Abramowicz. Bialystok, 2003. S. 341–359.
6. *Tyszkiewicz, K.* Pomniki rytownictwa krajowego. Oddział 1. Odciski z blach mniejszych, znajdujących się w bibliotece łohojskiej Konstantego hrabi Tyszkiewicza / [Электроны рэсурс]. Интернет-адрес: http://www.polona.pl/dlibra/doccontent2?id=2604&from=editionindex&dirids.

# ОСНОВНЫЕ СИСТЕМЫ УЧЕТА И ФИКСАЦИИ НАСЕЛЕНИЯ НА ТЕРРИТОРИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

**М. Р. Котенёв**

Развитие систем учёта и фиксации населения и подобных им систем на территории Беларуси свидетельствует о том, что в разные периоды истории нашей страны такие системы выполняли схожие функции, но использовались в разных целях, что сказывалось на правовом, социальном, экономическом и иных положениях населения. Особую актуальность данная тема приобретает в ракурсе формирования единого информационного пространства и информатизации, т.к. наша страна делает первые шаги в этой сфере и многие вопросы ещё не урегулированы на законодательном уровне, недостаточно развиты информационные отношения, техническая база функционирует в ограниченном режиме и другие. Всё это сказывается на развитии и функционировании систем учёта населения, а соответственно на возможности реализации своих законных прав и интересов и их защиту.

В рамках исследования были выявлены и дана характеристика основным системам учёта и фиксации населения на территории Республики Беларусь. Такими системами учёта являются:

1. Паспортная система;
2. Система регистрации населения;
3. Регистр населения.

Существует и функционирует много других важных систем учёта населения, но все другие системы выполняют какую-то специфическую, характерную для их сферы, функцию, а не конкретно учёта. Функции же вышеуказанных систем – именно учёт населения, сбор персональных данных о населении, фиксация его по месту жительства и пребывания.